**Верш: «Вайна»**

Крыкі, смерці, роў гармат…
Дзе спакой? Дзе цішыня?
Іх няма. Тут толькі кат,
І імя яму – вайна!

Хлопчык, дзесь гадкоў пяці,
Рукі матчыны цалуе,
Хоча ў іх жыццё знайсці,
Стуку ў сэрцы ўжо не ўчуе…

Учора ў госці шчэ хадзілі
Маці, ён, сястра Ганулька.
Сёння ж уранку іх забілі
Немцы… Ганну і матульку…

Маці! Родная! Матуля!
Мне халодна так, сагрэй!
Можа, да сябе прытуліш?!
Ну, прачніся ж ты хутчэй!

И заплакаў хлопчык горка,
Не заплакаў – закрычаў!
Крык маленькага Рыгоркі,
Быццам зоў, усіх заклікаў.

Плач Сусвету быў той зоў,
А на вуснах, як малітва:
«Людзі! Хопіць ліць вам кроў!
Не – усім войнам! Не – усім бітвам!»